# Гісторыя

*А.В. ДЗЕМІДОВІЧ*

## УЗАЕМАДАЧЫНЕННІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА З РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАВАЙ (першая трэць XVII ст.)

Рассматриваются ключевые моменты взаимоотношения Великого Княжества Литовского в составе Речи Посполитой с Российским государством в первой трети XVII в. Анализируется роль Великого Княжества Литовского в восточновнешнеполитическом направлении деятельности Речи Посполитой.

The following article deals with the key issues of relationship between the Great Duchy of Lithuania as part of the Riech Pospolitaia and the Russian State in the first three decades of the XVII th century. The author analyses the role of the Great Duchy of Lithuania in the eastern orientation of the foreign policy of the Riech Pospolitaia.

Становішча Рэчы Паспалітай на міжнароднай арэне ў першай трэці XVII ст. характарызавалася шматвектарнасцю і наяўнасцю актыўных знешнепалітычных акцый, якія былі прадыктаваны як агульнымі гістарычнымі ўмовамі, так і ўласнымі прыярытэтамі федэратыўнай дзяржавы.

Рэч Паспалітая па-ранейшаму заставалася адной з самых магутных і ўплывовых дзяржаў Еўропы, аднак адпаведны статус дзяржавы-лідэра прадвызначаў дыпламатычныя цяжкасці і ваенныя канфлікты з іншымі суб'ектамі міжнароднай палітыкі (барацьба за тэрыторыі, імкненне захаваць статус-кво і інш.), і ў першую чаргу з памежнымі краінамі.

У асноўным знешнепалітычная дзейнасць Рэчы Паспалітай у акрэслены перыяд была скіравана ў наступных напрамках: змаганне са Швецыяй за Прыбалтыку, перманентная канфрантацыя з паўднёвым суседам – Турцыяй і неадназначныя ўзаемадачыненні з Расійскай дзяржавай.

Нягледзячы на тое, што ўмовамі Люблінскай уніі 1569 г. прадугледжвалася сумесная знешнепалітычная дзейнасць Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) і Польшчы, узаемастасункі дзвюх частак Рэчы Паспалітай паказалі, наколькі гістарычная рэчаіснасць адрознівалася ад згаданых вышэй унітарных імператываў. Шмат у чым аўтаномны статус ВКЛ у складзе федэратыўнай дзяржавы ў першыя паслялюблінскія дзесяцігоддзі прадстаўляў пэўныя магчымасці самастойнасці ў сферы знешнепалітычных стасункаў, што дазваляла ўлічваць геапалітычнае становішча, палітычныя традыцыі і ўласныя інтарэсы Княства. Менавіта апошні момант, у прыватнасці ўзаемаадносіны ВКЛ з Расійскай дзяржавай, з'яўляецца аб'ектам дадзенага даследавання.

Заўважым, што гістарыяграфія акрэсленага пытання мае пэўную спецыфіку. Па-першае, амаль да нядаўняга часу пытанні знешняй палітыкі, міждзяржаўных стасункаў разглядаліся большасцю гісторыкаў праз прызму наяўных дзяржаўна-нацыянальных інтарэсаў, тым самым пазбаўляючы даследаванні аб'ектыўнасці. Па-другое, як правіла, знешнепалітычная дзейнасць і дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага атаясамліваліся большасцю гісторыкаў, успрымаліся як адно цэлае.

Упершыню асобныя аспекты знешнепалітычнай дзейнасці ВКЛ на ўсходнім кірунку ў паслялюблінскі перыяд знайшлі асвятленне ў працах расійскіх гісторыкаў М.М. Карамзіна, М.І. Кастамарава, В.В. Ключэўскага, С.Ф. Платонава, С.М. Салаўёва, В.М. Тацішчава. Капітальныя працы вядомых гісторыкаў канца XIX – пачатку XX ст. (М.К. Любаўскі, У.І. Пічэта, І.І. Лапо, В.Д. Дружчыц) не закраналі акрэсленую праблематыку ў сувязі з тым, што абмяжоўваліся XVI ст. У савецкі час знешнепалітычнае развіццё дзяржаў Усходняй Еўропы пачатку XVII ст. грунтоўна прааналізавалі Б.М. Флора, Р.Г. Скрыннікаў, аднак зыходзячы з прарасійскіх пазіцый. Толькі пачынаючы з 90-х гг. XX ст. у працах беларускіх гісторыкаў (А.П. Грыцкевіч, П.А. Лойка, Г.М. Сагановіч, У.Е. Снапкоўскі, І.В. Саверчанка) пачаліся аб'екыўна разглядацца пытанні знешнепалітычнага становішча ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай.

Польская гістарыяграфія прадстаўлена працамі Э. Апалінскага, Г. Віснэра, З. Войцыка, В. Крэгзайзена, Я. Мацішэўскага і інш. Як правіла, большасць істотных момантаў, якія датычыліся дыпламатыі Рэчы Паспалітай, абароны ад знешніх ворагаў, падаваліся праз прызму польскіх інтарэсаў і адпаведна ацэньваліся.

Мэтай артыкула з’яўляецца разгляд і аналіз знешнепалітычных адносін ВКЛ з Расійскай дзяржавай у першай трэці XVII ст.

Пры асвятленні дадзенай праблематыкі былі задзейнічаны такія крыніцы, як матэрыялы соймавых пасяджэнняў; эпісталярныя дакументы дзяржаўнага і прыватнага характару; тэксты перамірных грамат і дагавораў.

У XVII ст. Вялікае Княства Літоўскае і Расійская дзяржава ўвайшлі, маючы багатую гісторыю ўзаемаадносін, прычым узаемаадносін складаных і канфліктных. З канца XV ст. змест узаемадачыненняў між дзяржавамі-суседзямі набывае характар пастаяннай ваеннай канфрантацыі. Шматлікія войны XVI ст. з’явіліся заканамерным адлюстраваннем супярэчнасцей інтарэсаў і саперніцтва за лідэрства ва ўсходнееўрапейскім і балтыйскім рэгіёнах.

Аднак нестабільная геапалітычная сітуацыя ў Еўропе, якая дэманстравала мажлівую поліварыянтнасць камбінацый дзяржаўных саюзаў, што былі звернуты супраць трэцяй сілы (напрыклад, верагодны альянс Швецыі і Расійскай дзяржавы), таіла небяспеку і прымусіла ВКЛ у канцы XVI ст. адмовіцца ад заваёўніцкага знешнепалітычнага курсу Стэфана Баторыя ў адносінах да Масквы.

Дыпламатычная місія Льва Сапегі 1600 г. з’явілася яскравым пацвярджэннем вышэйзгаданай думкі. Пасольства ў Маскву мела на мэце заключыць вечны мір і прапанаваць адпаведны праект саюза між краінамі.

Паслы Леў Сапега, канцлер ВКЛ, Станіслаў Варшыцкі, кашталян варшаўскі, Гальяш Пельгрымоўскі, пісар ВКЛ, Яраслаў Друцкі Сакалінскі, стараста усвяцкі, Андрэй Варапай, аршанскі земскі суддзя, Ян Сапега, віцебскі ваявода, Міхаіл Францкевіч, Іван Пасек, Пётр Дунін, Ян Баруцкі і іншыя ўдзельнікі пасольства адправіліся да Масквы ў верасні 1600 г. Паслам былі нададзены надзвычайныя паўнамоцтвы, што пацвярджалася лістом Жыгімонта III да Барыса Гадунова: «…давши им достаточную науку и моц зупольную о добрых делах межы нами, великими господарьми хрестиянскими, и межы господарствы нашими ку доброму и пожыточному всего хрестьянства мовити и становити»[1]. Афіцыйны прыём Л. Сапегі Барысам Гадуновым і яго сынам Фёдарам адбыўся толькі 26 лістапада 1600 г., хоць пасольства прыбыло ў Маскву 16 кастрычніка. Непасрэдныя перамовы пачаліся яшчэ на тыдзень пазней. На другім пасяджэнні 4 снежня Леў Сапега выклаў умовы вечнага міру, якія ўключалі 24 артыкулы. У прыватнасці, наступныя: 1) каралі польскія і вялікія князі літоўскія, з аднаго боку, і князі маскоўскія – з другога, надалей павінны быць заўсёды ў згодзе і сяброўстве; 2) вораг Рэчы Паспалітай з’яўляецца ворагам Расійскай дзяржавы і наадварот; 3) заключэнне пагадненняў з іншымі краінамі павінна адбывацца толькі пасля папярэдняга ўзаемнага ўзгаднення; 4) у выпадку нападу ворага на адну з саюзных дзяржаў другая абавязана дапамагаць ёй; 5) землі, што будуць набыты сумеснымі намаганнямі, павінны належаць той дзяржаве, якая здаўна на іх правы мае; 6) землямі, здабытымі агульнымі сіламі, якія раней не належалі ні адной з дзвюх дзяржаў, валодаць сумесна ці падзяліць пароўну; 7) дазвол народам абедзвюх дзяржаў свабодна перамяшчацца ў межах як Рэчы Паспалітай, так і Расійскай дзяржавы і паступаць там на службу; 8) дазвол свабодна «женитися, кревнитися» людзям адной дзяржавы з людзьмі другой; 9) набыццё і трыманне маёмасці ўсімі сумленнымі спосабамі ў абедзвюх дзяржавах; 10) доступ да навучання жыхароў адной дзяржавы ў другую; 11) свабода веравызнання ў выпадку аселасці жыхароў адной дзяржавы ў другой; 12) прапанова будаваць у Расіі каталіцкія храмы; 13) наданне права купцам з усіх дзяржаў свабодна і бяспечна займацца купецтвам і гандлем; 14) злачынцаў, уцекачоў і «вшеляких шкодников» у выпадку, калі яны апынуцца на тэрыторыі адной з саюзных дзяржаў, без затрымкі вяртаць іх гаспадарам; 15) сумесная абарона супраць татар; 16) прадугледжвалася стварэнне агульнага флоту на Балтыйскім і Чорным морах; 17) манета павінна быць аднолькавая, аднаго кошту, адной вагі; 18) узаемнае каранаванне спецыяльна створанымі каронамі; 19) у выпадку смерці манарха Рэчы Паспалітай наступны абіраецца са згоды маскоўскага цара; 20) абавязковая прысутнасць маскоўскага пасла пры каранацыі караля польскага і вялікага князя літоўскага і ўскладванне ім асобнай кароны (пасля таго як адбудзецца каранацыя арцыбіскупам); 21) магчымасць абрання гаспадара расійскага каралём польскім і вялікім князем літоўскім у выпадку адсутнасці спадчыннага манарха; 22) пасля смерці маскоўскага цара яго сын пры ўзыходжанні на прастол павінен пацвердзіць прысягай саюз дзяржаў; 23) каранаванне ліцвінскім паслом маскоўскага цара асобнай каронай; 24) калі цар не пакідае нашчадкаў, маскоўскім уладаром становіцца манарх Рэчы Паспалітай[2].

Пры аналізе праекта істотным трэба будзе заўважыць наступнае. Наўрад ці можна трактаваць умовы дагавора як жаданне стварыць федэрацыю, хутчэй за ўсё меркавалася стварыць ваенны саюз з шырокімі культурна-эканамічнымі сувязямі. Безумоўна, праект прадугледжваў выгады і для польскага, і для ліцвінскага бакоў. Але Л. Сапега, які з’яўляўся аўтарам дагавора, усё ж больш клапаціўся аб ліцвінах, чым паляках. Артыкул праекта аб свабодным дазволе набываць землі і маёнткі жыхарамі Рэчы Паспалітай у Расійскай дзяржаве прадстаўляў палякам менш выгад і карысці, чым іхнім «братам» ліцвінам: далёкая адлегласць стварала істотнейшыя перашкоды жыхарам Польшчы валодаць і трымаць маёнткі ў межах Маскоўскай дзяржавы.

Па палітычна-эканамічных прычынах праект быў адвергнуты расійскім бокам. Заўважым, што ход перамоў ускладняўся прысутнасцю шведскіх паслоў і адпаведнымі палітычнымі «гульнямі» Барыса Гадунова: паслам Рэчы Паспалітай паведамілі аб тым, што Карл Судэрманскі перадае цару Эстонію (гэта можна расцэньваць як дыпламатычны націск), адначасова да ведама шведаў было данесена, што за саюз Масквы з Рэччу Паспалітай супраць Швецыі Жыгімонт аддасць Расіі ўсе землі ў Прыбалтыцы[3].

У выніку доўгіх абмеркаванняў і спрэчак 1 сакавіка 1601 г. было заключана перамір'е на 20 год: «…а войне в те перемирные 20 лет на обе стороны не быти, рати и войны не всчинати, и ничем не зацепляти, и с обе стороны мест нигде не поседати, и городов новых не ставити, и в земли и во всякие угодья у тех городов и у волостей до того перемирного сроку не вступатися…»[4]

Аднак мір з Масквой быў перапынены акцыяй Ілжэдзмітрыяды. Раптоўнае з'яўленне чалавека, аб'явіўшага сябе Дзмітрыем, сынам Івана Грознага, стала зручным момантам для знешнепалітычнага «экспромту» Рэчы Паспалітай.

Падтрымка польскімі магнатамі, спачатку Адамам Вішнявецкім, які варагаваў з маскоўскім князем з-за спрэчных зямель на левабярэжжы Дняпра[5], потым Юрыем Мнішкам, які ўвогуле «быў непераборлівым у сродках»[6] для задавальнення ўласных інтарэсаў меркантыльнага характару, падаравала Атрэп'еву шанс і паклала пачатак увасабленню авантурнай ідэі ў рэальнасць.

Складана адназначна ацаніць ступень падтрымкі самазванца афіцыйнымі коламі Польшчы. Актыўнай пазіцыі ў дадзеным пытанні сенатара Юрыя Мнішка, сандамірскага ваяводы, старасты львоўскага і самборскага, супрацьстаяла негатыўнае стаўленне да авантуры Яна Замойскага, канцлера польскага[7]. Бясспрэчна, што Ілжэдзмітрый быў падтрыманы і выкарыстаны ва ўласных мэтах манархам Рэчы Паспалітай – Жыгімонтам III не без удзелу рымскай курыі ў цэлым і каталіцкага кліру Польшчы ў прыватнасці[8].

Пазіцыя ВКЛ наконт самазванца была адназначнай. Так, яшчэ падчас падрыхтоўкі Ю. Мнішкам паходу Ілжэдзмітрыя І на Маскву віленскі ваявода М.К. Радзівіл Сіротка папярэджваў, што гэта можа мець згубныя наступствы для Рэчы Паспалітай: «Дзеянні такія могуць прывесці не толькі да дрэнных вынікаў, але і да згубы Айчыны»[9]. Ліст Льва Сапегі Крыштафу Радзівілу ад 31 кастрычніка 1604 г. змяшчаў наступнае: «Пасварыць нас пан ваявода сандамірскі з Масквой, пашанцуе яму альбо не, аднак зло айчыне і нам учыніць»[10]. Маршалак літоўскі Дарагастайскі на сойме 1605 г., які абмяркоўваў пытанне аб садзейнічанні Ілжэдзмітрыю, выказаў наступнае: «Ваша вялікасць за сябе асабіста прысягала быць у міры (з Маскоўскай дзяржавай. – *А. Д.*), вы прысягалі і за нас – сенатараў і за шляхецкае саслоўе… Адзін сенатар сам паехаў з Дзмітрыем, яго з ім суправаджалі ваенныя людзі з польскага рыцарскага стану. Гэта трэба своечасова выправіць…»[11]

Неабгрунтаванай падаецца думка Р. Скрыннікава аб тым, «што ў супрацьвагу знаці дробная шляхта з энтузіазмам падтрымала планы вайны з Расіяй»[12]. Заўважым, што пытанне мажлівага канфлікту з усходнім суседам выклікала занепакоенасць сярод грамадства ВКЛ. Напрыклад, слонімскі соймік на пачатку 1605 г. заклікаў быць асцярожнымі і клапаціцца аб захаванні пакою Рэчы Паспалітай[13]. Такі настрой быў характэрны для шляхты ўсіх беларускіх зямель. Пасля паражэння Ілжэдзмітрыя І пад Дабрынічамі 31 студзеня 1605 г. узмацніліся настроі неўмяшальніцтва ў маскоўскія справы. У інструкцыі 1605 г. паслам на віленскі сход ад Гродзенскага павета князю Крыштофу Радзівілу і пану Філону Копацю прадпісвалася сачыць, каб не парушана было перамір'е з Масквой «свавольнымі людзьмі князя Дзмітрыя Угліцкага»[14]. Ліцвіны з відавочнасцю зразумелі ўсю небяспеку сітуацыі. Асабліва гэта датычыцца шляхты памежных з Маскоўскай дзяржавай паветаў. Насельніцтва гэтых земляў вельмі непакоілася з магчымасці маскоўскіх выпраў. Пасол ад Віцебскага павета патрабаваў ад урада Рэчы Паспалітай неадкладных мер па ўмацаванні абароны межаў дзяржавы[15].

Настрой эліты грамадства ВКЛ у адносінах да ўсходняга суседа пачаў змяняцца дзесьці з 1608 г., чаму садзейнічаў шэраг абставін. Хісткае трыманне Васіля Шуйскага на прастоле, баярская апазіцыя, дзеянні Ілжэдзмітрыя ІІ стваралі спрыяльныя ўмовы для рэалізацыі актуальнай мэты: вяртанне Смаленскай зямлі і далучэнне Маскоўскай дзяржавы да Рэчы Паспалітай. Да Жыгімонта III з самых разнастайных крыніц даходзілі звесткі аб тым, што знатныя расійскія баяры гатовы перадаць яму царскі трон і заключыць унію. «…Маскоўская экспедыцыя была адобрана… На поўным сходзе ўсе сенатары, за выключэннем толькі траіх ці чацвярых, згодны былі ў тым, каб я. в. кароль не ўпускаў такога выпадку» – паведамляюць запіскі гетмана Жалкеўскага[16]. Такім чынам, пытанне аб маскоўскай вайне было вырашана на карысць яе вядзення.

Леў Сапега раіў каралю пачаць з заваявання Смаленска, з чаго і пачалася ваенная кампанія супраць Расіі ў верасні 1609 г.[17] Заўважым, што авалодаць горадам было надзвычай складана: з канца 80-х гг. XVI ст. вакол Смаленска была ўзведзена адмысловая фартыфікацыйная сістэма. Толькі ў выніку двухгадовай асады 13 чэрвеня 1611 г. Жыгімонт авалодаў горадам.

Тым часам «тушынскія» баяры падпісалі пад Смаленскам 2 студзеня 1610 г. папярэдні дагавор аб узвядзенні Уладзіслава на рускі прастол. Пасля дэтранізацыі В. Шуйскага «сямібаяршчына» заключыла другі дагавор з гетманам Жалкеўскім аб афіцыйным прызнанні Уладзіслава

царом. Аналіз абодвух пагадненняў дае падставы расцэньваць іх як імкненне заключыць звычайны ваенны саюз (і не больш) з умовай выбрання на маскоўскі прастол каралевіча Уладзіслава. Заўважым, што большая частка артыкулаў дагавораў была практычна антырэчпаспалітаўскай і абавязвала Уладзіслава «прытрымлівацца праваслаўя, адміністрацыйнага парадку і саслоўнага ладу Масквы»[18].

Са згоды баяр у верасні 1610 г. польскія і ліцвінскія войскі занялі Маскву. Між іншым сярод акружэння манарха Рэчы Паспалітай пачалі з'яўляцца праціўнікі ваеннай экспансіі. Гетман Жалкеўскі, канцлер Сапега, з'яўляючыся дальнабачнымі палітыкамі, жадалі ўрэгуляваць адносіны шляхам перамоў. Сітуацыя ўскладнялася тым, што Жыгімонт не дапускаў сына да маскоўскага трону. Ён сам прэтэндаваў на царскі прастол.

У канцы 1612 г. ваенныя злучэнні Рэчы Паспалітай пакінулі Маскву ў выніку паражэння ў супрацьстаянні з народным апалчэннем на чале з К. Мініным і Д. Пажарскім.

На Варшаўскім сойме 1613 г. Леў Сапега выступіў з прамовай, у якой шкадаваў аб няўдачнай выправе на Маскву: «…і прастол, і ўсё гаспадарства маскоўскае з рук выпушчана і дарэмна страчана… Рэч Паспалітая ўцягнута ў вечную вайну з гэтым народам… які раздражнілі, да згоды і еднасці прымусілі сваімі гвалтоўнымі ўчынкамі прыйсці»[19].

Сапраўды, магчымасць пакарыць Маскву была страчана, і наступныя паходы войск Рэчы Паспалітай з мэтай заваёвы ўсходніх зямель (1615 г., 1617–1618 гг.) не прынеслі жадаемых вынікаў. Недахоп сродкаў, пацыфісцкі настрой грамадства ВКЛ (якое пакутавала ад вайны непараўнальна больш, чым Польскае Каралеўства) вымушалі ўрад Рэчы Паспалітай адмовіцца ад агрэсіўных намераў і пайсці на заключэнне перамір'я. Варта адзначыць, што ВКЛ лічыла ўласныя прэтэнзіі на адваяваныя расійскія землі куды больш доказнымі і гістарычна апраўданымі, чым польскія. У спрэчцы ВКЛ з Польшчай аб прыналежнасці Смаленшчыны паказальна пазіцыя Льва Сапегі, выказаная ў лісце да Януша Радзівіла напрыканцы 1611 г.: «Браты нашыя палякі канстытуцыю напісалі народу нашаму шкодную... прывілей напісалі сабе на Смаленск і на іншыя правінцыі і замкі, нібыта гэта ім кароль даруе, што ў Маскве возьмуць. Вымушаны быў учыніць пратэст супраць той канстытуцыі і таго дыплому»[20]. Пазіцыю канцлера актыўна падтрымала шляхта беларускіх зямель. Урэшце рэшт канфлікт вырашыўся кампрамісным шляхам. Адпаведна Дэўлінскаму пагадненню (снежань 1618 г.) да ВКЛ адыходзіла Смаленшчына, да Польшчы – Ноўгарад-северскія і Чарнігаўскія землі, што яшчэ раз падкрэслівала адасобленасць у знешнепалітычай сферы дзвюх частак Рэчы Паспалітай. За Уладзіславам IV захаваўся тытул цара маскоўскага і ўсяе Русі, што не мела аніякага практычнага значэння, бо трон належаў прадстаўніку дынастыі Раманавых.

Зразумела, што Расійскую дзяржаву не маглі задаволіць умовы Дэўлінскага пагаднення, і на працягу больш дзесяцігоддзя пасля яго маскоўскім урадам выношвалася ідэя вайны-рэванша. Рэальным увасабленнем яе сталася Смаленская вайна 1632–1634 гг.

Падводзячы вынікі, хацелася б акрэсліць моманты-крытэрыі, якія дазваляюць сцвярджаць аб узаемастасунках менавіта Вялікага Княства Літоўскага з Расійскай дзяржавай, не падмяняючы назву часткі федэрацыі «Вялікае Княства Літоўскае» агульнай назвай «Рэч Паспалітая». Найперш неабходна адзначыць як бы фармальны момант, які тым не менш вырашаў многае. Захаванне ВКЛ пасля Люблінскай уніі асобнага адміністрацыйнага апарату, сярод якога бадай што найважнейшае месца займала пасада канцлера, што ўжо само па сабе прадугледжвала актыўную пазіцыю Княства ў вырашэнні пытанняў міжнароднага характару. Законныя паўнамоцтвы канцлера ВКЛ уключалі ў сферу яго кампетэнцыі вядзенне дыпламатычных стасункаў з Расійскай дзяржавай. Дзеянні Льва Сапегі, без ведама і ўдзелу якога не абышлося ні адно палітычнае мерапрыемства ў адносінах да Расіі ў першай трэці XVII ст., – яскравае сведчанне гэтаму. Правамерным будзе адзначыць яго праліцвінскую пазіцыю ў справах на карысць «агульнай Айчыне Рэчы Паспалітай»: пэўныя артыкулы «вечнага міру», «падзел» Смаленска і інш.

Уласныя погляды і інтарэсы ВКЛ, якія праламіліся праз адносіны да Ілжэдзмітрыя І, таксама з'уляюцца спецыфічным адлюстраваннем знешнепалітычнага курсу Княства. Аб актыўнасці ВКЛ дазваляе гаварыць удзел ліцвінскага войска, узначальванне аб'яднаных вайсковых злучэнняў гетманам ВКЛ Янам Каралем Хадкевічам падчас інтэрвенцыі 1609–1618 гг.

Дзеянні Вялікага Княства Літоўскага на міжнароднай арэне і адносіны да асноўных пытанняў знешняй палітыкі шляхты – рашаючай сілы ў палітычным жыцці дзяржавы – часам былі ўзгоднены з польскім бокам, часам – не. Але бясспрэчна, што ВКЛ, па мажлівасці, кіравалася ўласным бачаннем спраў, а не ішло ў фарватэры інтарэсаў Польшчы і цэнтральнай улады, якая часам імкнулася навязаць ВКЛ неапраўданы знешнепалітычны курс, мэты якога былі далёкія ад дзяржаўных інтарэсаў.

[1] Lietuvos metrika. Kn. № 594 (1585–1600). Vilnius, 2006. P. 292.

[2] Гл.: Trębicki W. Poselstwo Lwa Sapiehy w roky 1600 do Moskwy, podlyg dyaryusza Eljasza Pielgrzymowskiego sekretarza poselstwa, z rekopisy trafem odkrytego przez Wladyslawa Trębickiego opisane. Grodno, 1846. S. 29–40.

[3] Гл.: Tyszkowski K. Poselstwo Lwa Sapiehy w Moskwie w roky 1600. Lwow, 1927. S. 61.

[4] Сборник императорского Русского исторического общества. М., 1912. Т. 137. С. 71.

[5] Гл.: Скрынников Р.Г. Самозванцы в России в начале XVII в. Григорий Отрепьев. М., 1990. С. 67.

[6] Костомаров Н. Кто был первый Лжедимитрий? СПб., 1864. С. 60.

[7] Гл.: Русская историческая библиотека (РИБ). СПб., 1872. Т. 1. Стб. 18.

[8] Гл.: Rome et Démetrius d'aprés des documents nouveaux avec pieces justificatives et facsimile par le P. Pierling. Paris, 1878. P. 197.

[9] Wisner H. Rzeczpospolita Wazów: W 2 t. T. 1. Wojsko Wielkiego księstwa Litewskiego, dyplomacia, varia. Warszawa, 2004. S. 223–224.

[10] Archiwum domy Radziwillow (ADR). Krakŏw, 1895. T. 8. S. 233.

[11] РИБ. СПб., 1872. Т. 1. Стб. 6–8.

[12] Скрынников Р.Г. Указ. тв. С. 77.

[13] Гл.: Wisner H. Op. cit. S. 224.

[14] Лойка П.А. Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мн., 2002. С. 59.

[15] Гл.: Wisner H. Op. cit. S. 225.

[16] Гл.: Записки гетмана Жолкевского о Московской войне. СПб., 1876. С. 18.

[17] Гл.: Памятники обороны Смоленска (1609–1611) / Ю.В. Готье. М., 1912. С. 31.

[18] Флоря Б.Н. Русско-польские отношения и политическое развитие Восточной Европы во второй половине XVI – начале XVII в. М., 1978. С. 276.

[19] Любавский М. Литовский канцлер Лев Сапега о событиях смутного времени. М., 1901. С. 13–15.

[20] ADR. Krakŏw, 1895. T. 8. S. 253.

Паступіў у рэдакцыю 17.06.08.

***Алена Васільеўна Дземідовіч*** – аспірант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў П.А. Лойка.